$$Z = \left(\frac{3}{a}\right)^{1/b}$$

Объем фонда, рассчитанный по этой формуле, близок к оптимальному. Поскольку оптимальный фонд формируется на базе существующего, для улучшения его состава необходимо анализировать структуру и содержание фонда. Для выявления активных разделов фонда накапливаются статистические данные по частоте обращения к различным документам в каждом тематическом подмассиве фонда. Под активной частью фонда часто понимается такое количество наиболее часто запрашиваемых документов, которое обеспечивает до 95 % удовлетворения информационных потребностей пользователей.

Информетрический анализ документальных информационных потоков дает возможность разработки эффективных критериев оценки документальных потоков с точки зрения их полноты и соответствия тематики информационным потребностям пользователей.

---

*Нешитой, В. В.* Статистические методы анализа использования библиотечного фонда / В. В. Нешитой, Б. В. Петренко // Вестник БАЕ. – 2013. – № 2. – С. 84–86.

***Н. В. Петухова,***
*кандыдат педагагічных навук,*
*старшы выкладчык*
*кафедры этналогіі і фальклору*

# РЭКАНСТРУКЦЫЯ НАРОДНАЙ МУЗЫКІ Ў МАЛАДЗЁЖНЫХ ФАЛЬКЛОРНЫХ АНСАМБЛЯХ

Адраджэнне традыцыйнай музычнай культуры пасродкам маладзёжных фальклорных ансамбляў з'яўляецца адной з самых актуальных праблем сучаснай практычнай музычнай фалькларыстыкі. Ёй прысвечана праца супрацоўнікаў кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў В. В. Калацэя, Н. В. Матыліцкай, Э. В. Шчадрынай, В. А. Лабачэўскай і інш., якіх цікавяць пытанні гісторыі, тэорыі і методыкі творчага асваення рэгіянальных традыцый фальклорнага выканання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На думку прафесара кафедры, доктара філасофскіх навук Э. К. Дарашэвіча, у сучасным грамадстве народная музыка ўяўляе сабой каштоўнасць не толькі як рэпертуарны рэсурс або сродак фарміравання эстэтычнага густу, але і як інфармацыйны канал, як сродак наладжвання камунікацыі паміж пакаленнямі, трансляцыі і ўзнаўлення сацыяльна-культурнага вопыту грамадства. Найбольшы інтарэс даследчыка выклікае сістэма светапоглядных ідэй нашых продкаў, заключаных у паэтычным змесце твораў, якія адлюстроўваюць ідэалы народнай свядомасці. Іх спасціжэнне шляхам успрымання і інтэрпрэтацыі ва ўласнай мастацка-творчай дзейнасці фальклорных артэфактаў: песень, танцаў, гульняў, карагодаў і інш. – дазваляе аднавіць спецыфіку камунікацыйнага акта, асаблівасці ідэйна-эстэтычнай макрасферы традыцыйнага соцыуму [1].

Студэнты, удзельнікі фальклорных калектываў кафедры цікавыя і незвычайныя. Кожны з іх – будучы фалькларыст, асоба, якой рухае жаданне пазнання нацыянальных каранёў, культуры свайго народа. Сучасны ўзровень ведаў заканамерна прыводзіць іх да думкі аб сістэмным характары фальклору, адзінкамі якога з'яўляюцца песні, міфы, танцы, якія заўсёды існуюць у кантэксце цэласных фальклорных актаў. Гук і слова, рух і жэст, усё багацце мімічных сродкаў, колер, малюнак, працэс спеваў, гульні, расповеду, танца, драматызацыі ўтвараюць непарыўнае адзінства, арганізуемае драматургіяй гэтага акта, яго скіраванасцю на дасягненне сацыяльна значных мэт. Такім чынам, яны спасцігаюць фальклор не толькі як мастацтва, але і як вербальныя і паравербальныя (акцыянальныя, прадметна-матэрыяльныя і інш.) спосабы праяўлення, як асаблівы малюнак свету, які складваўся ў народнай свядомасці тысячагоддзямі, перадаваўся з пакалення ў пакаленне і не страціў сваёй змястоўнай актуальнасці і каштоўнасці і ў нашы дні.

Так студэнты кафедры дасягаюць высокага ўзроўню ведаў і выканальніцкага майстэрства. Яны не толькі таленавітыя спевакі, якія валодаюць добрымі галасамі і прыроднай музычнай адоранасцю, але і маладыя даследчыкі-эксперыментатары, якія імкнуцца да пазнання сутнасці фальклору, назапашвання пэўнай сукупнасці ведаў аб дадзеным культурным феномене і іх актуалізацыі ў канцэртна-выканальніцкай і рэкрэацыйна-асветніцкай дзейнасці. Назапашаныя веды падштурхоўваюць іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дбайна і ўпарта працаваць над якасцю спеваў, пільна сачыць за набліжэннем да традыцыі-першакрыніцы, вырашаць задачы па прапагандзе і папулярызацыі народнага мастацтва. Студэнцкія калектывы шмат удзельнічаюць у канцэртных выступленнях, конкурсах, фальклорных фестывалях, разнастайных культурна-масавых мерапрыемствах. Пры гэтым імкнуцца аднавіць цэласны, сінтэтычны мастацкі вобраз, які раскрывае ўзаемасувязь народнага мастацтва з жыццём чалавека.

Вялікае значэнне для прафесійнай падрыхтоўкі будучых фалькларыстаў мае наведванне Рэспубліканскіх этнаграфічных канцэртаў «Фальклор беларускай глыбінкі», знаёмства з творчасцю аўтэнтычных выканаўцаў твораў народнага мастацтва (песень, танцаў, казак, карагодаў, інструментальнай музыкі). Арганізуючы гэту работу, супрацоўнікі кафедры Т. А. Пладунова і В. В. Калацэй зыходзілі з даўно вядомых сведчанняў збіральнікаў фальклору аб тым, што паўнавартаснае эстэтычнае ўздзеянне фальклорны твор аказвае толькі падчас яго «жывога» аўтэнтычнага выканання і непасрэднага ўспрымання ад носьбітаў. Незвычайная прыгажосць фальклорных твораў, узмоцненая натуральнасцю трансляцыі, усведамленне сваёй роднасці з тымі, хто некалі жыў і выконваў гэтыя творы, аказвае незабыўнае ўражанне на студэнтаў, адкрывае новыя эмоцыі, асацыяцыі, гарманічныя структуры, драматургічныя камбінацыі і г. д. Непасрэднае ўспрыманне «жывога» выканання паглыбляе жыццёвы і музычны вопыт студэнтаў, садзейнічае павышэнню інтарэса да ўспрымання фальклоных твораў і ўдасканалення выканальніцкага майстэрства, а непасрэдныя стасункі з носьбітамі фальклору ўзбагачае жыццё калектываў, спрыяе выхаванню павагі да людзей, якія жывуць побач, абуджае жаданне берагчы і працягваць мастацкія традыцыі Беларусі.

Такім чынам, пытанне аб лёсе традыцыйнага музычнага фальклору ў сучасных жыццёвых умовах застаецца адным з найбольш значных і папулярных тэм практычнай музычнай фалькларыстыкі. Падрыхтоўка спевакоў-фалькларыстаў на кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў уносіць найвялікшы ўклад у захаванне і папулярызацыю традыцыйнай народнай музычнай культуры. Кожны студэнт кафедры ўнікальны і нясе ў сабе ве-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ды, атрыманыя ў працэсе зносін з аўтэнтычнымі выканаўцамі фальклору, пераймаючы іх вопыт і тым самым працягваючы рух наперад да нацыянальнай культуры без страт.

1. *Дарашэвіч, Э. К.* Выкарыстанне фальклору ў фарміраванні светапогляду суб'екта культуры / Э. К. Дарашэвіч // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2013. – № 1 (19). – С. 11–15.

***Н. Е. Петушко,***
*кандидат педагогических наук, доцент,*
*доцент кафедры менеджмента*
*информационно-документной сферы*

## ПОЛЬЗОВАТЕЛИ ПОЖИЛОГО ВОЗРАСТА КАК СУБЪЕКТЫ СОЦИАЛЬНОЙ РАБОТЫ БИБЛИОТЕКИ

В настоящее время демографическая ситуация в мире складывается таким образом, что из года в год растет абсолютная численность и удельный вес пожилых людей. Беларусь не является исключением: доля пожилых граждан (60 лет и старше) составляет около 20 % от общей численности населения республики. За последние пять лет эти показатели увеличились соответственно на 1,3 % и продолжают расти [5]. Данные цифры, с одной стороны, свидетельствуют о росте численности пожилых лиц в структуре населения и, соответственно, увеличения демографической нагрузки на граждан трудоспособного возраста. С другой стороны, снижение рождаемости населения и процентного соотношения лиц младших возрастов ведет к увеличению нагрузки на систему социальной защиты и повышает требования к социальной работе с людьми пожилого возраста. Учитывая складывающуюся ситуацию, социальная работа в Республике Беларусь ориентирована на повышение качества жизни пожилых граждан посредством создания им условий для независимого проживания и эффективного участия в жизни общества. При этом важным является формирование доступной среды жизнедеятельности лиц старшего поколения, обеспечивающей возможность беспрепятственного передви-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ